# ТОЛЬКІ ТРОЕ...

## І ЧАСЦІНКА ЯЕ ПРАЦЫ...

Вось ужо больш як дваццаць гадоў працуе ў Ленінскай бібліятэцы Вера Іванаўна Партнова. Пад яе «апекай» —каля трох тысяч аспірантаў, кандыдатаў і дактароў навук, выкладчыкаў навучальных устаноў, чытачоў з вышэйшай адукацыяй. Вера Іванаўна—загадчыца сектара навуковых чытальных залаў.

Для сур'ёзнай прадукцыйнай работы з кнігай неабходны адпаведныя ўмовы.

— Стараемся рабіць усё, каб чытачы прыходзілі сюды як дамоў, і ў той жа час траплялі б у атмасферу творчую, рабочую,— гаворыць Вера Іванаўна.— Да кніг у нас свабодны доступ. Я працую тут ужо даўно, і чытачы ў нас пастаянныя, таму мы добра ведаем адзін аднаго.

Вера Іванаўна ведае, хто над якой тэмай працуе, і загадзя рыхтуе пэўную літаратуру. Чытачу не прыходзіцца марнаваць каштоўны час.

Тут, у вялізным рабочым кабінеце, кожны дзень нараджаецца чарговая старонка дысертацыі, дыплома, артыкула, кнігі.

— Вось, напрыклад, М. Куняўскі,— расказвае Вера Іванаўна, — тут, у нас, напісаў кандыдацкую, абараніўся, зараз працуе над доктарскай. В. Молакаў—таксама. Дактары эканамічных навук І. Басманаў і С. Аўсянікаў, доктар філасофіі Г. Давідзюк, доктар гістарычных навук прафесар Г. Ліфшыц і многія, многія іншыя—ці пералічыш усіх!—рыхтавалі ў нас свае дысертацыі.

У поспеху гэтых вучоных ёсць часцінка працы і В. Партновай. Яна не адзін раз была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрстваў культуры СССР і БССР, а некалькі гадоў назад Вера Іванаўна атрымала значок выдатніка бібліятэчнай працы. Апошняя з яе ўзнагарод—Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР.

Упэўнены, — не апошняя.

**М. ЖАДАЎ.**

## У ПРАСТОРАХ КНІЖНАГА МОРА

Кніжны фонд павінен пастаянна папаўняцца—гэта «залаты» закон бібліятэчнай працы. Сектарам цякучага камплектавання ў Ленінскай бібліятэцы загадвае Ганна Філіпаўна Мазжухіна. Ад яе, ад таго, наколькі дакладна і аператыўна будзе яна арыентавацца ў прасторах кніжнага мора, у многім залежыць, як хутка атрымае чытач неабходнае яму выданне. І ці атрымае наогул. Каб чытач меў усю неабходную яму літаратуру, каб нічога не «ўпусціць», патрэбна пастаянна сачыць за бібліяграфіяй, за навінкамі кніжнага рынку. Але не толькі гэтым займаецца Г. Мазжухіна. Сумарны ўлік паступленняў, бягучая работа